# ЧАЛАВЕК І ЭКАЛОГІЯ



Зберaглі нашы продкі Айчыну,
Нашу мову для нас зберaглі...
Дык няўжо мы пустэчу пакінем
На пакутнай курганнай зямлі?

*Віктар Шніп*

Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **будзем знаходзіць** сэнсавыя часткі апавяданняў, вызначаць галоўнае ў кожнай частцы;

✓ **будзем вучыцца** вызначаць праблемы, узнятыя пісьменнікамі ў мастацкіх творах; выказваць уласныя пачуцці, якія выклікалі вершы, байкі і апавяданні на экалагічную тэму; выразна і правільна чытаць творы ўголас з захаваннем інтанацыі сказаў, паўз, патрэбнага тону і тэмпу, перадаваць рытм пры чытанні вершаў.

**Варта задумацца.** Навошта чалавеку патрэбна клапаціцца пра стан прыроды?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Слова **экалогія** прыйшло да нас са старажытнагрэчаскай мовы. Частка **эка** абазначае ‘дом, радзіма’, а **логас** — ‘вучэнне’. На сёння **экалогія** — гэта навука, якая вывучае жыццё розных арганізмаў у навакольным асяроддзі.

Экалогія вывучае, як расліны, жывёлы і людзі існуюць разам, як уплываюць адзін на аднаго і на навакольнае асяроддзе.

### *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце плакат на экалагічную тэму.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Чаму, на ваш погляд, мастак падзяліў плакат на дзве роўныя часткі?

2) Якая з частак вам спадабалася больш і чаму?

3) Чаму аўтар плаката адлюстраваў планету Зямля ў руках чалавека? Паразважайце.

**Будзённы** — не святочны дзень; штодзённае жыццё.
**Аздóба** — тое, што ўпрыгожвае, аздабля́е што-небудзь.
**Стрóнгавы** — *тут:* прэснаводны, чысты.
**Суіснава́ць** — быць разам у наяўнасці, разам жыць і падтрымліваць адно аднаго.

## Беручы — аддаваць

*Янка Сіпакоў*



Наш родны беларускі край! Ён прыгожы. Там, дзе цячэ Дзвіна, у якую задумліва глядзяцца елкі і сосны, і пятляе між палёў Бярэзіна; дзе струменіць, набіраючыся сілы, Нёман і шырыцца, выбіраючыся з балот, Прыпяць; дзе гамоніць з высокімі берагамі Дняпро і трэцца хвалямі аб лодкі ласкавы Сож... Ён, наш край, прыгожы і непаўторны сваімі рэкамі і азёрамі, сваімі лясамі і лугамі, сваімі сцежкамі і дарогамі...

Белавежская пушча і Браслаўскія азёры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач, Бярэзінскі запаведнік і маленькая рэчка Проня — усё гэта наш родны край, наша спадчына, якая аднойчы і назаўсёды даецца кожнаму чалавеку разам з жыццём.

Так, спадчына. Неацэнная. За ўсё даражэйшая. Але хто калі лічыў, хто калі задумаўся, колькі ж на душу насельніцтва, на душу кожнага з нас прыпадае кветак, матылёў, дрэў, птушак, крынічак? Усяго гэтага мы, занятыя вечным клопатам, паўсядзённаю працаю, часцей за ўсё не заўважаем — ён для нас такі ж звыклы і будзённы, як і паветра, — гэты цуд прыроды!



Правауладальнік Акадэмія адукацыі

Так, мы звыкла ўсім гэтым карыстаемся. Часам нават забываемся, што прырода — не толькі для нас адных, хоць чалавек і з'яўляецца самаю лепшаю аздобаю любога краявіду. Што, беручы ў яе ўсё, чым яна так шчодра з намі дзеліцца, трэба думаць пра будучыню і абавязкова трэба пакідаць у ёй месца і той жа рэчцы, і таму ж буслу, і той жа травінцы, і таму ж мурашу. Пакідаць усё, што ім трэба.

Бо ўсе мы на гэтай зямлі суседзі — рэчка і бусел, дрэва і травінка, кветка і пчала, мураш і чалавек. Усе мы зямляне. Бо зямля ў нас адна, яна агульная для ўсіх. І мы маем радасць суіснаваць на ёй. Жыць у дружбе і ва ўзаемнай павазе.

Таму, беручы ў прыроды, мы абавязаны захоўваць яе багацці і павялічваць іх. Беручы — аддаваць.

?

1. Якімі багаццямі беларускага краю захапляецца аўтар? Пералічыце.
2. Што пісьменнік называе родным краем, спадчынай? Прачытайце. Ці можна пагадзіцца з гэтым меркаваннем? Чаму?
3. Вызначце тэму апавядання.
4. На што аўтар звяртае ўвагу ў творы? Выберыце адказ з ліку прапанаваных:
   а) варта задумацца, колькі прыпадае на аднаго чалавека розных жывых істот;
   б) лес — гэта цуд прыроды;
   в) трэба берагчы прыроду;
   г) чалавек павінен штодзённа любавацца прыродай.
5. Знайдзіце і прачытайце словы, якія раскрываюць асноўную думку твора.

Паразважайце, якія пасільныя справы, мерапрыемствы па захаванні прыроды вы ўжо можаце ажыццявіць самастойна.

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны беларускага мастака Уладзіміра Анішчанкі «Мой родны кут».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Па якіх дэталях можна здагадацца, што на карціне паказаны беларускі кут у летнюю пару года?

2) Вусна апішыце, як выглядае рэчка, яе пра́вы і левы берагі.

3) Чаму, на вашу думку, мастак адлюстраваў уздоўж рэчкі сцяжынку?

4) Апішыце, як выглядае на дальнім плане неба.

5) Якія ўражанні і настрой выклікала ў вас гэта карціна? Чаму?

6) У чым сугучнасць двух твораў — апавядання Янкі Сіпакова і карціны Уладзіміра Анішчанкі?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі